Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# КАЛЯНДАР ДАТ, ПАДЗЕЙ КОБРЫНШЧЫНЫ

***краязнаўча-бібліяграфічны каляндар
на 2016 год***




Кобрын 2016

ББК 91.(4Беі)
К 17

***Складальнік:***

*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі ДУК “Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка”

***Камп’ютарны дызайн вокладкі:***

*П. С. Грыневіч* – інжынер-праграміст ДУК “Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка”

*Ю. П. Пракапук* – бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі ДУК “Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка”

***Рэдактар:***

*М. В. Іванова* – дырэктар ДУК “Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка”

**Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны:** краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук; рэдактар М. В. Іванова. – Кобрын, 2016. – 107 с.: каляр. фота.

# ПРАДМОВА

Краязнаўчы каляндар змяшчае звесткі аб знамянальных падзеях Кобрыншчыны на 2016 год. Даты, уключаныя ў каляндар, адлюстроўваюць падзеі і факты гісторыі, грамадскага, палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця рэгіёна; памятныя даты вядомых людзей, біяграфіі якіх звязаны з краем.

Спісы да юбілейных дат уключаюць кнігі і артыкулы з газет і часопісаў. Матэрыял размешчаны ў наступным парадку: спачатку кнігі па алфавіту, потым артыкулы з газет і часопісаў у адваротным парадку (у межах года – па алфавіту).

Каляндар адрасуецца ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца сваёй малой радзімай ці выкарыстоўвае краязнаўчыя звесткі ў прафесійнай дзейнасці.

Краязнаўчы каляндар выкарыстоўваецца пры планаванні работы бібліятэкі, правядзенні масавых свят і юбілейных мерапрыемстваў, пры складанні паўнатэкставых краязнаўчых баз даных.

# Асноўныя юбілейныя даты горада і раёна

## *Кобрынскі раён у фактах і падзеях*



***1366 г.*** Польскі кароль Казімір III Вялікі пацвярджае права вялікага князя літоўскага Альгерда на Кобрын.

***1566 г.*** Кобрынскі павет увайшоў у склад Берасцейскага ваяводства.

***1586 г.*** Кобрын перайшоў ва ўладанне каралевы Ганны Ягелонкі.

***1706 г.*** Войскі шведскага караля Карла XII падчас Паўночнай вайны 1700-1721 гг. захапілі і разграбілі Кобрын.

***1711 г.*** Эпідэмія знішчыла больш за палову жыхароў г. Кобрына. Пачаўся заняпад горада.

***1766 г.*** Польскі кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі пазбавіў горад магдэбургскага права. Кобрын быў пазбаўлены гарадскога самакіравання і пераўтвораны ў звычайнае землеўласніцкае паселішча пад назвай Кобрынскі Ключ Брэсцкай эканоміі.

***1791 г.*** Кобрын стаў цэнтрам Кобрынскага павета Брэсцкага ваяводства.

***1801-1921 гг.*** Кобрынскі павет у складзе Гродзенскай губерні.

***1846 г.*** Праз Кобрын пракладзена шаша Масква – Варшава. У горадзе пабудавана паштовая станцыя.

***1866-1867 гг.*** У кобрынскай турме ў сувязі з удзелам у паўстанні знаходзіўся Напалеон Орда – мастак, кампазітар, піяніст. Вядома 5 графічных замалёвак г. Кобрына, выкананых Н. Ордам.

***1921 г.*** Па Рыжскаму мірнаму дагавору Кобрынскі павет увайшоў у склад Палескага ваяводства Польшчы.




***Карта Кобрынскага павета 1921-1939 гг.***

***1941 г. 22-23 чэрвеня*** Пад Кобрынам ішлі жорсткія баі па абароне горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (123-і знішчальны авіяполк пад камандаваннем маёра Б.М. Сурына, 22-я танкавая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра В.П. Пуганава).

***1941 г. 23 чэрвеня*** Кобрын акупаваны нямецкімі войскамі.

**Пліско, Н. М.** Так пачыналася / Н. М. Пліско // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.137-139. - ( Ішла вайна народная).

***1941 г. лета-восень*** Пачатак фарміравання на Кобрыншчыне падпольнага і партызанскага руху з разрозненых нелегальных груп.

***чэрвень*** Арганізаваны атрад імя М.М. Чарнака ў Старасельскім лесе Жабінкаўскага раёна з груп ваеннаслужачых 84-га і 125-га стралковых палкоў, пагранічнікаў, якія апынуліся ў акружэнні, і жыхароў Старасельскага сельсавета.

**Атрад імя М.М. Чарнака** / падрыхтавала Н.М. Пліско // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 176-177. - (1941-1945).

## Іпацьеўскі летапіс – 740 гадоў з часу стварэння

Іпацьеўскі летапіс - адзін з найстаражытнейшых летапісных зводаў Русі. Спіс 15 стагодзя быў знойдзены Мікалаем Карамзіным у Іпацьеўскім манастыры пад Кастрамой, ад якога летапіс і атрымаў сваю назву. Летапіс складаецца з трох асноўных частак:

- Аповесць мінулых гадоў з падзеямі да 1117.
- Кіеўскі летапісны звод з падзеі 1118-1199.
- Галіцка-Валынскі летапіс з падзеямі да 1292.

З Іпацьеўскага летапіса: «*Се аз, князь Володимер, сын Васильков, внук Романов, пишу грамоту: дал есмь княгине своей, по своем животе город свой Кобрынь и с людьми, и с данью, како при мне даяли, тако и по мне ать дають княгине моей…*». Так у лета 6795 ад «стварэння свету», згодна з летапіснай традыцыяй, ці ў 1287 г., княгіня Вольга Раманаўна атрымала па завяшчанні Кобрын. Гэта першае вядомае на сённяшні дзень пісьмовае ўпамінанне пра горад. Узнік Кобрын яшчэ раней. У Іпацьеўскім летапісе ён паўстае як горад, што ўжо склаўся на поўначы Валынскай зямлі, за Прыпяццю.

# Юбілейныя даты вёсак Кобрынскага раёна

## Асмаловічы – 230 гадоў

**Асмаловічы** (мясцовая назва Осмоловычы) - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце. У 1786 г. сяло ў Брэсцкай эканоміі Брэсцкага ваяводства ВКЛ, 1 валока 90 маргоў зямлі (1 морг = 0,71 га). З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1897 г. вёска ў Іласкай воласці, каля гандлёвага шляху Антопаль - Пружанскі павет, 33 двары, 198 жыхароў, 189,25 дзесяціны зямлі (на 1890), народнае вучылішча. Побач знаходзіўся аднайменны пасёлак, 16 жыхароў, карчма. У 1905 г. у вёсцы 194 жыхары; пасёлку - 17. З 1921 г. вёска ў складзе Польшчы, у Іласкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 25 двароў, 97 жыхароў. У 1930-я гады працавалі школа, вячэрнія курсы, тэатральны гурток. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Дзямідаўшчынскім, з 16.7.1954 г. у Грушаўскім, з 21.1.1961 г. у Гарадзецкім сельсаветах, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г.- 210 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну Асмаловічы акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. На 1.1.1999 г. 28 двароў, 51 жыхар, у складзе калгаса-камбіната імя Дзяржынскага. На 1.01. 2015г. колькасць насельніцтва складае 16 жыхароў.

**Асмаловічы** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 118-119.

**Князева, В.М. Асмаловічы** / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 564. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

## Боркі – 230 гадоў

**Боркі** - вёска ў Астроміцкім сельсавеце, за 23 км ад г. Кобрына, 67 км ад г. Брэста. У 1786 г. сяло ў Брэсцкай эканоміі ВКЛ, 16 валок зямлі. У 1795 г. вёска Кобрынскай эканоміі, 17 двароў, 94 жыхары. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска ў Падалескай воласці, 93 дзесяціны зямлі. Побач знаходзілася аднайменнае ўрочышча, уладанне П. Паўзуна, 60 дзесяцін зямлі. У 1897 г. Боркі - вёска, 13 двароў, 83 жыхары; дом (былая Жухавецкая застава) пры Варшаўска-Маскоўскай шашы, 11 жыхароў; 2 прыватнаўласніцкія сядзібы Боркі

(Палоншчызна), 16 і 11 жыхароў. У 1905 г. вёска, 183 жыхары, і фальварак, 7 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Падалескай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 20 двароў, 121 жыхар. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Красналескім, з 16.7.1954 г. у Астроміцкім сельсаветах. У 1940 г. вёска, 29 двароў, 162 жыхары, і хутар, 2 двары, 15 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну Боркі акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. У 1949 г. арганізаваны калгас «Чырвоны бор». Паводле перапісу 1970 г. – 224 жыхары. На 1.1.1999 г. 38 двароў, 89 жыхароў, магазін, у складзе калгаса імя Леніна (з 2004 ААТ "Астромічы"). На 1.01. 2015 г. колькасць насельніцтва складае 34 жыхары.

Помнік ахвярам фашызму, на ўшанаванне памяці 18 жыхароў вёскі, якія былі расстраляны фашыстамі ў 1943 г.

**Боркі** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 125.

**Князева, В.М.** Боркі / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 564. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

**Хільчук, Т.** Удзячны за свята / Т. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 11 верасня. – С. 2. – Аб свяце вёскі Боркі.

**Курэша, В.** Святкавала вёска Боркі / В. Курэша // Кобрынскі веснік. – 2002. – 7 верасня. – С. 7. – 25 жніўня ў в. Боркі прайшло традыцыйнае свята вёскі.

## *Быстрыца – 475 гадоў*

**Быстрыца** (мясцовая назва Быстрыця) - вёска ў Залескім сельсавеце, за 4 км ад г. Кобрына, 51 км ад Брэста. На скрыжаванні аўтадарог Мінск-Брэст і Кобрын-Лунінец.

У 1541 г. Быстрычы - маёнтак каля Кобрына, уладанне манастыра Святога Спаса ў Кобрыне (падаравана манастыру Іванам Сямёнавічам Кобрынскім). У 1597 г. млынар Быстрыцы Лягатаўскага войтаўства Кобрынскага староства меў 2 валокі зямлі. У 1742 г. Быстрыца, ці Млынары - сяло, 30 маргоў зямлі, царква. У 1786 г. 10 валок 18 маргоў зямлі. З 1795 г. у Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1897 г. вёска ў Залескай воласці, 56 двароў, 333 жыхары, хлебазапасны магазін; 385,5 дзесяціны зямлі (на 1890). У 1905 г. 342 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы,

у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 12 двароў, 60 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Закросніцкім, з 16.7.1954 г. у Залескім сельсаветах. У 1940 г. хутары Быстрыца, 74 двары, 330 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну Быстрыца акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. Паводле перапісу 1970 г. – 345 жыхароў. На 1.1.1999 г. - 221 двор, 609 жыхароў, магазін, цэнтр брыгады № 3 калгаса імя Суворава. У 2005 г. – 241 гаспадарка, 683 жыхары. На 1.01. 2015 г. колькасць насельніцтва складае 826 жыхары.

**Быстрыца** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 127.

**Князева, В.М.** Быстрыца / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 569-570. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

## *Дзівін – 550 гадоў*

**Дзівін** (мясцовая назва Дывэн, Дыввін) - вёска, цэнтр Дзівінскага сельсавета, каля воз. Любань. За 33 км ад г. Кобрына, 78 км ад Брэста. Транспартныя сувязі па аўтадарогах на Брэст, Драгічын.




Першае ўпамінанне ў 1466 г. У 1546 г. - мястэчка ў Дзівінскай воласці Брэсцкага павета ВКЛ. У 1566 г. - 184 двары, рыначная плошча, 5 вуліц. У 1629 г. кароль Жыгімонт ІІІ пацвердзіў дзівінцам права на штотыднёвы кірмаш па чацвяргах. У 1668 г. - горад, у Палескім ключы Брэсцкай эканоміі, 53 валокі зямлі, 2 млыны, агароды, карчма, з 1642 г. меў Магдэбургскае права, аднак войта са шляхты прызначаў кароль. У 1682 г. у горадзе 2 царквы (мелі 2 вольныя валокі зямлі), ратуша (2 валокі), касцёл (4 валокі), 2 млыны, карчма. У 1789 г. - горад і Двор у



Дзівінскім ключы Брэсцкай эканоміі. У горадзе рыначная плошча, 4 вуліцы, 194 гаспадаркі, 872 жыхары, у Двары жылы дом, бровар, студня і іншыя гаспадарчыя пабудовы. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. З сакавіка 1797 г. мястэчка Дзівін, 988 жыхароў падаравана нашчадкам генерал-фельдмаршала графа П.А. Румянцава-Задунайскага. У 1819 г. сяляне і жыхары мястэчка (звыш 200 двароў, 1000 жыхароў) адмовіліся выконваць павіннасці на карысць свайго ўладальніка да канчатковага разгляду справы аб іх вольнасці. 20.8.1819 г. у Дзівін прыбыло 300 узброеных салдат. Улады былі вымушаны дазволіць местачкоўцам выбраць 10 чалавек для перамоў. Асэсар Гродзенскага губернскага праўлення і кобрынскі земскі спраўнік у прысутнасці салдат зачыталі сялянам указ губернскага праўлення. У сваім данясенні яны прасілі ваеннай дапамогі ў губернатара і адзначалі, што духавенства падтрымлівае сялянскі пратэст. У 1886 г. мястэчка, цэнтр воласці, 159 двароў, 1644 жыхары, 5516,25 дзесяціны зямлі (у 1890), валаснoе праўленне, 3 праваслаўныя царквы (511,75 дзесяціны зямлі ў 1890), сінагога, школа, 5 крам, заезны двор, 2 піцейныя дамы, 3 кірмашы. Каля мястэчка знаходзіўся маёнтак Дзівін, уладанне А. Ягміна, ветраны млын, 8135,5 дзесяціны зямлі (разам з іншымі маёнткамі і фальваркамі Ягміна). У 1888 г. у мястэчку 2516 жыхароў, у праваслаўным прыходзе 3663 вернікі. У 1897 г. мястэчка, 873 двары, 3796 жыхароў, 3 царквы, сінагога, яўрэйскі малітоўны дом, народнае вучылішча (у 1889/90 навучальным годзе вучыліся 74 хлопчыкі, 9 дзяўчынак; у 1892/93 г. - 71 хлопчык, 9 дзяўчынак), сельская лячэбніца, валаснoе праўленне, паштовае аддзяленне, 2 хлебазапасныя магазіны, 15 дробных крам, маслабойня, 14 млыноў, піцейны дом, 6 аднадзённых кірмашоў на год. У маёнтку - 60 жыхароў. У 1905 г. у Дзівіне 3967 жыхароў, у народным вучылішчы 100 хлопчыкаў, 4 дзяўчынкі, у маёнтку 58 жыхароў. З 1915 г. мястэчка і маёнтак акупіраваны войскамі кайзераўскай Германіі, з 1919 г. - польскімі войскамі. З 1921 г. у складзе Польшчы, цэнтр гміны Кобрынскага павета Палескага ваяводства; мястэчка, 373 дамы, 2299 жыхароў; фальварак, хутары і калонія, 71 двор, 403 жыхары. У 1931 г. Дзівінская гміна налічвала 8326 жыхароў, 84 населеныя пункты, займала плошчу ў 280 км2, працавалі яўрэйская бібліятэка, тэатральны і харавы гурткі. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. цэнтр раёна і сельсавета Брэсцкай вобласці. У 1940 г. у мястэчку 1009 двароў, 4187 жыхароў, у асадзе вайсковай Дзівін 13 двароў, 64 жыхары; працавалі паштовае аддзяленне, сямігадовая школа (400 вучняў), аптэка, бальніца з амбулаторыяй, ветпункт, народны дом, 20 прыватных крам, хлебны і кніжны магазіны, 2 маторныя млыны, 3 хлебапякарні, бойня жывёлы, рэстаран, сельпо, абутковая і кавальская арцелі,

завод прахаладжальных напіткаў, маслазавод. Дзівінскі раён налічваў 138 населеных пунктаў, 11 сельсаветаў, 26 117 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну 24.6.1941 г. Дзівін акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія знішчылі ў раёне і вёсцы 2819 жыхароў. Вызвалены 21.7.1944 г. часцямі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту. У цэнтры вёскі пахаваны 74 савецкія воіны і 2 партызаны, якія загінулі ў баях пры вызваленні вёскі (у 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск). 1450 жыхароў вёскі, якія былі расстраляны гітлераўскімі карнікамі ў 1942 г., пахаваны на тэрыторыі завода металічных вырабаў (у 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск). У 1945 г. адноўлена МТС, пачала друкавацца райгазета «Ленінскі прызыў» (адказны рэдактар А. Мельнікаў), у 1947 г. будавалася няпоўная сярэдняя школа, працавалі раённы клуб, бібліятэка, новы магазін, на тэрыторыі раёна 11 хат-чытальняў. У 1949 г. у вёсцы створаны калгас «Зара», у 1950 г. адкрыты дзіцячыя яслі, пачалося будаўніцтва новага будынка райбальніцы. З 8.8.1959 г. - у Кобрынскім раёне, 3489 жыхароў. У 1970 г. – вёска, цэнтр калгаса “Новае жыццё”, 4677 жыхароў. На 1.1.1999 г. - 1553 двары, 4293 жыхары. Размешчаны будынкі выканкама сельсавета і адміністрацыі калгаса, Дом культуры, клуб, 3 бібліятэкі, музычная, спартыўная і сярэдняя школы, бальніца, школа-інтэрнат, 2 дзіцячыя сады, камбінат бытавога абслугоўвання, кафэ, 6 магазінаў, ветлячэбніца, аддзяленне сувязі. Працуюць пякарня, 2 лясніцтвы, сумеснае беларуска-нямецкае швейнае прадпрыемства “Лангхайнрых Канфекцыён Бел”. На 1.01. 2015 г. колькасць насельніцтва складае 3162 жыхары.

Помнікі археалогіі: стаянка і паселішча на беразе возера Любань.

Помнікі архітэктуры: Прачысценская царква (1902) і царква Параскевы Пятніцы (1740).



**Дзівін** // Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. / рэд. кал.: П.У. Броўка і інш. – Мінск, 1971. – Т. 4. – С. 200.

**Дзівін** // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1998. – Т. 6. – С. 111.

**Дзівін** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 139-141.

**Дзівін** / галоўны рэдактар Т.У. Бялова // Культура Беларусі: энцыклапедыя. – Мн: Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – Т. 3. - С. 394.

**Дивин** // Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. - Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 322-323.

**Дивин** // Республика Беларусь: энциклопедия : в 6 т. - Мн., 2006. – Т. 3. - С. 373.

**Илларионова, Л.** Удивляй, Дивин! / Л. Илларионова // Брэстчына вачамі журналістаў. – Брэст : ААТ “Брэсцкая друкарня”, 2005. – С. 146 – 153.

**Князева, В.М. Дзівін** / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 576-578. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

**Мешечко, Е.Н.** Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти: Путеводитель. - Брест, 2012. - С. 162.

**Ткачова, С.** Дзівін: аповед пра родную вёску / С. Ткачова // Берасцейскія карані – 98: гісторыка-краязнаўчы зборнік . – Брэст, 1998. – С. 121 – 123.

**Цітоў, А.** Гарадская геральдыка Беларусі / А. Цітоў. – Мн.: Полымя, 1989. – 207 с. - Са зместу: в. Дзівін Кобрынскага раёна – С. 53.

**Дзівінскі** шлях : газета для дзівінчан / склад. Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2015. - 15 ліпеня. - С. 4. - Старонка адлюстроўвае навіны вёсак Дзівінскага с/с.

**Дзівінскі шлях:** газета для дзівінчан / склад. Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2015. - 9 верасня. - С. 5. - Упамінаюцца СВК "Любань", Дзівінская СШ, пагранзастава "Дзівін", бальніца.

**Гармель, И.** Зачем в Дивин, что на Кобринщине, зачастили евреи со всего света?.. / Инна Гармель // Белорусская нива. - 2013. - 26 января. - С. 11. -

**Берднік, І.** Адкрыццё Айчыны / Іван Берднік // Народная трыбуна. - 2013. - 8 лютага. - С. 11. - Упамінаецца пасёлак Дзівін.

**Бялоў, Д.** Дзівінскі шлях : газета для дзівінчан / Дзмітрый Бялоў; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. - 26 студзеня. - С. 3. - Упамінаецца Дзівінская бальніца, сярэдняя школа і школа мастацтваў, СВК "Любань".

**Бялоў, Д.** Дзівінскі шлях / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 28 ліпеня. - С. 4. - Газета для дзівінчан, вып. 5.

**Бялоў, Д.** Дзівінскі шлях / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 5 мая. - С. 4. - Газета для дзівінчан, вып. 4.

**Пашкович, Л.** Одним абзацем / Л. Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2012. - 3 сакавіка. - С. 10. - В нынешнем году Дивин будет газифицирован на 100%.

**Пашкович, Л.** Природный газ - уже у нас! / Л. Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2011. - 29 кастрычніка - С. 4. - В Дивине активно ведется газификация.

**Пашковіч, Л.** Дзівінскі шлях / Л. Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 29 кастрычніка. - С. 4.

**Пашковвіч, Л.** Дзівіну - 545! / Л. Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 7 вер. - С. 4. - 545 гадоў з дня заснавання вескі адсвяткавалі жыхары Дзівіна.

**Бялоў, Д.** Дзівінскі шлях / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 16 чэрвеня. - С. 3.

**Дзівінскі шлях** // Кобрынскі веснік. - 2010. - 17 лютага. - С. 3. - Што ўяўляе Дзівін сёння.

**Гармель, И.** Мало просто подивиться / И. Гармель // Белорусская нива. - 2009. - 10 января. - С. 5. - О перспективах д. Дивин.

**Деревня** Дивин // Кобрынскі веснік. - 2009. - 14 студзеня. - С. 3. - О благоустройстве д. Дивин.

**Сацук, А.** Перемены на благо людей / А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 2008. - 12 ліпеня. - С. 2. - Дивин поменяет свой статус и станет агрогородком.

**Тоболич, А.** Городок с приставкой "агро" / А. Тоболич // Заря. - 2008. - 14 июня. - С. 6. - О том, что необходимо сделать в будущих агрогородках д. Дивин, пос. Ореховский.

**Пянко, А.** Дивин накануне перемен / А. Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. - 1 снежня. - С. 2. - Строительство агрогородка в Дивине запланировано на 2008 год.

**Петровская, М.** В местечке старом жизнь бурлит / М. Петровская // Кобрынскі веснік. – 2006. – 27 верасня. – С. 1. – Свята в. Дзівін.

**Накануне события** // Кобрынскі веснік. – 2006. – 16 верасня. – С. 3. - В последнее воскресенье сентября намечено провести праздник д. Дивин.

**Чопко, М.** Какие наши годы / М. Чопко // Заря. – 2005. – 15 января. – С. 2. - Дивин. Фотозарисовка В. Короля.

**Уязны** знак в. Дзівін // Кобрынскі веснік. – 2005. – 15 кастрычніка.

**Дзівінскі сельсавет:** Візітная картка // Кобрынскі веснік. – 2004. – 24 красавіка. – С. 3 – 6.

**Илларионова, Л.** Удивляй, Дивин! / Л. Илларионова // Вечерний Брест. – 2003. – 9 июля. - С. 8 – 9.

**Пятроўская, М.** Дзівінскія навіны / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 6 лістапада. – С. 1.

**Пятроўская, М.** Дзівінскія навіны / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 12 ліпеня. – С. 3. - Дзівін сёння.

**Пращурович, А.** Откуда имя твое, Дивин? / А. Пращурович // Заря. – 2002. – 26 февраля. – С. 3.

**Шугай, А.** Дзівін / А. Шугай // Кобрынскі веснік. – 2001. – 4 красавіка. – С. 3. – З гісторыі і пра сённяшні дзень сяла.

**Ляўковіч, А.** Мой новы знаёмы – Дзівін / А. Ляўковіч // Звязда. – 1998. – 17 студзеня. – С. 5. – З гісторыі сяла, яго сучаснасць.

**Пянко, А.** Дзівін: на мяжы стагоддзяў / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 29 кастрычніка. – С. 2.

**Вёска** змяніла аблічча // Кобрынскі веснік. – 1996. – 16 кастрычніка.–С. 2.

**Алексяюк, А.** Дзівін: ведай свой край / А. Алексяюк // Камуністычная праца. – 1979. – 18 студзеня.

**Увасюк, Б.** Прыгажэе Дзівін / Б. Увасюк // Камуністычная праца. – 1973. – 1 мая.

## Дубіны – 470 гадоў

**Дубіны (**мясцовая назва Дубыны) - вёска ў Аніскавіцкім сельсавеце (з 2012 г. Гарадзецкім с/с), каля Арэхаўскага канала. За 33 км ад г. Кобрына, 79 км ад Брэста.

Упершыню ўпамінаецца ў 1546 г. як урочышча. У 1890 г. - пасёлак у складзе в. Вуглы Гарадзецкай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, 1130 дзесяцін зямлі (разам з 7 іншымі пасёлкамі в. Вуглы). У 1897 г. вёска Вуглы (Дубіны), 8 двароў, 76 жыхароў. У 1905 г. 160 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Гарадзецкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 9 двароў, 40 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Аніскавіцкім сельсавеце, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. 32 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну Дубіны акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. У 1949 г. вяскоўцы стварылі калгас «Маладая гвардыя». У 1965 г. на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у цэнтры вёскі ўстаноўлены абеліск. Паводле перапісу 1959 г. налічвалася 148 жыхароў, у 1970 – 180. На 1.1.1999 г. - 51 двор, 126 жыхароў, цэнтр калгаса імя Кірава (з 2004 ААТ “Аніскавічы”). Дзейнічаюць магазін,

фельчарска-акушэрскі пункт. На 1.01. 2015 г. колькасць насельніцтва вёскі складае 91.

Помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**Дубіны** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 142.

**Князева, В.М. Дубіны** / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 579. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

## Запруды – 130 гадоў

**Запруды** - вёска ў Астроміцкім сельсавеце, за 18 км ад Кобрына, 62 км ад Брэста. На аўтадарозе Кобрын-Баранавічы.



У 1886 г. вёска ў Іласкай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, паштовая станцыя, лаўка. У 1890 г. у Падалескай воласці таго ж павета, 110,75 дзесяціны зямлі. Побач знаходзіўся аднайменны маёнтак, уладанне П.Шыраева, 736 дзесяцін зямлі (разам з фальваркам Астрамеч і лясной дачай Гіркаўка). У 1897 г. на месцы сучаснай вёскі існавалі: вёска (пры Маскоўска-Варшаўскай шашы), 18 двароў, 117 жыхароў; выселак Запруды (Дзеркачова), 1 двор, 7 жыхароў; былыя паштовая станцыя, 11 жыхароў, і карчма, 18 жыхароў; дом аховы №14 на 17-й вярсце ад ст. Свадбіч - ст.Запруды, 6 жыхароў; дом Запруды (Бор), 6 жыхароў; лясныя старожкі: Запруды, 11 жыхароў, і Запруды (Горкаўка), 5 жыхароў; 3 прыватнаўласніцкія сядзібы - Запруды, 11 жыхароў; Запруды (Цямніца), 6 жыхароў; Запруды (Буда), 9 жыхароў. У 1905 г. Запруды - вёска, 156 жыхароў, і маёнтак, 22 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Падалескай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 14 двароў, 80 жыхароў, і фальварак, 2 двары, 25 жыхароў. У 1927 г. адкрыта бібліятэка (45 кніг на польскай мове, 39 чытачоў), працавалі школа, тэатральны гурток, праводзіліся нядзельныя чытанні. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 16.7.1954 г. у Астроміцкім сельсавеце. У 1940 г. у вёсцы

20 двароў, 56 жыхароў, у былым маёнтку 10 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну Запруды акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 г. па ліпень 1944 г. У першыя дні вайны непадалёку ад вёскі размяшчаўся запасны камандны пункт 4-й арміі Заходняга фронту. Каля вёскі ў баях з акупантамі загінулі 27 савецкіх воінаў і 2 партызаны. У 1957 г. устаноўлены помнік. У 1949 г. 27 гаспадарак з вёсак Запруды і Мачульнікі аб’ядналіся ў калгас «Чырвоны араты» (старшыня А.П. Брашавец). Паводле перапісу 1959 г. у Запрудах – 128 жыхароў, у 1970 г. – 156. На 1.1.1999 г. 97 двароў, 257 жыхароў, у складзе калгаса імя Леніна (з 2004 ААТ “Астромічы”). Працуе магазін, амбулаторыя, базавая школа. На 1.01. 2015 г. колькасць насельніцтва складае 192 жыхары.



Замчышча XIV-XVII ст. Помнікі на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, а таксама помнік ахвярам фашызму на ўшанаванне землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях за вёску.

**Запруды** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 148.

**Запрудскі** замак // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1998. – Т. 6. – С. 535.

**Князева, В.М. Запруды** / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 582. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Васильев, П.** Праздник на деревенской улице / П. Васильев // Заря. – 2003. – 28 августа. – С. 2. – В д. Запруды состоялся праздник деревни.

**Хільчук, М.** Запруды святкавалі, людзей добрых шанавалі / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 23 снежня. – С. 3. – Свята в. Запруды.

**Гурин, А.** Их расстреляли за околицей / А. Гурин // Заря. – 1989. – 14 октября. – Увековечение и благоустройство места массового расстрела людей в д. Запруды.

## Зосіна – 95 гадоў

**Зосіна** - вёска ў Астроміцкім сельсавеце, 28 км ад Кобрына, 73 км ад Брэста. Звязана з аўтадарогай Кобрын-Івацэвічы. У 1921 г. - вёска, 21 двор, 119 жыхароў, у Байкоўскай гміне Пружанскага павета Палескага ваяводства Польшчы. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Бакунскім сельсавеце таго ж раёна. У Вялікую Айчынную вайну Зосіна акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. У 1970 г. вёска ў Астроміцкім сельсавеце Кобрынскага раёна, 64 жыхары. На 1.1.1999 г. 54 двары, 160 жыхароў, у саўгасе «Дружба». На 1.01. 2015г. колькасць насельніцтва складае 81 жыхар.

**Зосіна** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 149.

**Князева, В.М. Зосіна** / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 583. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

## Каташы – 325 гадоў

**Каташы** (мясцовая назва Коташі) - вёска ў Хідрынскім сельсавеце, за 10 км ад г. Кобрына, 48 км ад Брэста. Транспартныя сувязі па аўтадарозе Кобрын-Макраны.



У 1691 г. - сяло ў Брэсцкім ваяводстве ВКЛ. У 1890 г. - вёска Верхалескай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, 178,25 дзесяціны зямлі. У 1897 г. 17 двароў, 122 жыхары, хлебазапасны магазін. У 1905 г. - 133 жыхары. З 1921 г. - у складзе Польшчы, у Навасёлкаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 7 дамоў, 49 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Хідрынскім, з 16.7.1954 г. да 18.12.1972 г. у Пецькаўскім сельсаветах. У 1940 г. 19 двароў, 128 жыхароў. У

Вялікую Айчынную вайну Каташы акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. У 1950 г. 30 вясковых гаспадарак аб’ядналіся ў калгас імя А. Васілеўскага. На 1.1.1999 г. 86 двароў, 210 жыхароў, у складзе калгаса «Зара» (з 2004 г. СВК “Узыходзячая зара”). Дзейнічаюць магазін, клуб. На 1.01. 2015г. колькасць насельніцтва складае 218 жыхароў. У в. Каташы знаходзяцца вайсковыя могілкі часоў 1-й сусветнай вайны.

**Каташы** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 154.

**Князева, В.М. Каташы** / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 586. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

**Коренчук, П.** Деревенька моя… / П. Коренчук // Кобрынскі веснік. 2000. – 12 ліпеня. – С. 3. – Из истории деревень Хидринского с/с.

## Корчыцы – 525 гадоў




**Корчыцы** (мясцовая назва Корчычы) - вёска ў Хідрынскім сельсавеце, за 12 км ад г. Кобрына, 57 ад Брэста. Транспартныя сувязі па аўтадарозе Кобрын-Дзівін.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з XV ст. (1491 г.) як сяло Кобрынскага княства ВКЛ. У 1491 г. княгіня Фядора Іванаўна (з роду Рагацінскіх, жонка князя Івана Сямёнавіча Кобрынскага) падаравала сяло Корчыцы з усімі даходамі манастыру Святога Спаса ў Кобрыне. Гэта было пацверджана ў 1512 г. вялікім князем ВКЛ і каралём Польшчы Жыгімонтам I Старым, у 1533 г. - яго жонкай каралевай Бонай, у 1647 г. каралём Уладзіславам IV і г.д. У 1668 г. Корчыцы - фундушавае сяло Кобрынскай архімандрыі, якое вызвалялася ад

ваенных пабораў і пастояў. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. 2 вёскі ў Верхалескай воласці: Корчыцы-Кіганы, 421,5 дзесяціны зямлі, і Корчыцы-Забужкі, 601,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. вёскі налічвалі: Кіганы (Корчыцы) 30 двароў, 215 жыхароў, царква на могілках, хлебазапасны магазін; Забужкі (Корчыцы) 42 двары, 304 жыхары, хлебазапасны магазін. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Навасёлкаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства. Вёскі - Корчыцы Вялікія, 26 двароў, 166 жыхароў, і Корчыцы Малыя, 21 двор, 77 жыхароў. У 1930-я гады працавалі школа і вячэрнія курсы. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. да 30.10.1959 г. у Верхалескім с/с, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. вёскі - Корчыцы Вялікія, 64 двары, 315 жыхароў; Корчыцы Малыя, 42 двары, 179 жыхароў, працавала пачатковая школа. У Вялікую Айчынную вайну Корчыцы акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. У 1949 г. арганізаваны калгасы: імя



*церковь св. Иоанна Богослова ў В. Корчыцы*

Варашылава ў в. Вялікія Корчыцы (старшыня М.А.Кірылюк); імя Чапаева ў в. Малыя Корчыцы (25 гаспадарак, старшыня Ф.Кірылюк). Паводле перапісу 1959 г. вёскі налічвалі: Корчыцы Вялікія – 260 жыхароў, Корчыцы Малыя – 160 жыхароў; у 1970 – адпаведна 262 і 144 жыхары. Пазней вёскі былі аб’яднаны ў адну пад назвай Корчыцы. На 1.1.1999 г. вёска, 187 двароў, 523 жыхары, цэнтр калгаса «Сцяг Перамогі» (з 2004 СВК “Раданежскі”). Ёсць клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

На 1.01.2015г. колькасць насельніцтва складае 471 жыхары.

**Князева, В.М.** Корчыцы / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 588. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Корчыцы** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 156-157.

**Коренчук, П.** Деревенька моя… / П. Коренчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 12 ліпеня. – С. 3. – Из истории деревень Хидринского с/с.

## Лелікава – 470 гадоў

**Лелікава** (мясцовая назва Леліково) - вёска ў Дзівінскім сельсавеце, за 47 км ад г. Кобрына, 97 км ад Брэста.




Вядома ў XVI (1546 г.) ст. на тэрыторыі Ратненскага павета Каралеўства Польскага. У 1774 г. Лелікава - маёнтак у Холмскай зямлі Рэчы Паспалітай. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Ковельскім павеце. У 1883 г. вёска, цэнтр Лелікаўскай воласці, у Ратненскай паліцэйскай акрузе. Побач знаходзіўся аднайменны фальварак, уладанне Быкоўскіх. Мелася каталіцкая капліца Ратненскай парафіі. У XVIII ст. у вёсцы пабудавана драўляная Дзмітрыеўская царква (захавалася да нашага часу). З 1921 г. у складзе Польшчы, цэнтр гміны Камень-Кашырскага павета Палескага ваяводства, 157 дамоў, 744 жыхары. У 1930-я гады ў вёсцы працавалі школа, вячэрнія курсы, чытальня, тэатральны гурток. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г.у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. да 16.7.1954 г. цэнтр Лелікаўскага сельсавета, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. у вёсцы 266 двароў, 1294 жыхары, няпоўная сярэдняя і пачатковая школы, магазін, хата-чытальня, паштовае аддзяленне, сельсавет, медпункт, пажарнае дэпо, участкі лясгаса і леспрамгаса. У Вялікую Айчынную вайну Лелікава акупіраваны ня-мецка-фашысцкімі захопні-камі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. У баях з фашысцкімі захопнікамі загінуллі 39 аднавяскоўцаў (у 1965 г. на могілках устаноўлены абе-ліск). У 1949 г. 60 вясковых гаспадарак аб’ядналіся ў калгас «Чырвоная звязда». Паводле перапісу 1959 г. вёска налічвала 960 жыхароў, у 1970 г. – 1084 жыхары. На 1.1.1999 г. у вёсцы 354 двары, 1064 жыхары, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа.

У 2006 г. на сродкі І.П. Панасюка, прадпрымальніка з Навасібірска і ўраджэнца в. Лелікава, пабудаваны тэнісны корт. На 1.01. 2015г. колькасць насельніцтва вёскі складае 613 жыхароў.



Помнік на ўшанаванне памяці 39 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Помнік архітэктуры XVIII ст. - Дзмітрыеўская царква.



**Гісторыя** Беларускай ССР: у 5-ці т. - Мн., 1972. – Т.1. - С. 54.- Са зместу: Насельніцтва паморскай культуры ў IV – II стст. да н.э. (в. Лелікава Кобрынскага раёна).

**Князева, В.М.** Лелікава / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 589. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

**Лелікава** // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. – Т. 9. – С. 195.

**Лелікава** // Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. / рэд. кал.: П.У. Броўка і інш. – Мінск, 1972. – Т. 6. – С. 299.

**Лелікава** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 158-159.

**Леликовская** Дмитриевская церковь // Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. - Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 16.

**Ганчук, А.** "Адной рукой гайдай калыску сына..." / А. Ганчук // Народная трыбуна. - 2012. - 5 кастрычніка. - С. 11. - Вёска Лелікава.

**Ляшкевіч, І.** Лелікава будзе жыць / І. Ляшкевіч // Звязда. - 2007. - 31 мая

**Гордей, Е.** Над селом – лелеки / Е. Гордей // Белорусская нива. - 2007. - 10 ноября. - С. 14. - О деревне Леликово - краевед П. Шепетюк.

**Куварына, Т.** Край, куды вяртаюцца буслы / Т. Куварына // Маладосць. – 2006. - № 11. – С. 106 – 111. – Свята в. Лелікава.

**Праздник** в Леликово // Кобрин-информ. – 2006. – 31 августа. – С. 3.

**Вясковае** свята з расійскім акцэнтам // Народная трыбуна. – 2006. – 2 верасня. – С. 3. – Вёска Лелікава адзначыла 460-годдзе з дня заснавання.

**Петровская, М.** Родной деревне посвящается / М. Петровская // Кобрынскі веснік. – 2006. – 30 жніўня.

**Хільчук, М.** З малітваю і песняю ўдвая святочны дзень / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 3 верасня. – С. 3. – У Лелікава адзначылі 460-годдзе з часу першага ўпамінання.

**Козлович, В.** "Песняры" чествовали Леликово / В. Козлович // Вечерний Брест. – 2003. – 29 августа. – С. 3. – 460-летие со дня основания широко отмечала д. Леликово Кобринского района.

**Подарил** деревне праздник // Заря. – 2003. – 2 сентября. – С. 1. – Деревня Леликово отметила свое 460-летие.

**Свістуновіч, С.** Свята ў Лелікава / С. Свістуновіч // Звязда. – 2003. – 29 жніўня. – С. 7. – 460-годдзе вёскі адзначылі жыхары в. Лелікава.

**Шугай, А**. Дзе селяцца буслы / А. Шугай // Камуністычная праца. – 1990. – 20 верасня. – Вёска Лелікава, старажылы вёскі, ёсць фота.

**Байкон, Н**. Леликово вчера и сегодня / Н. Байкон, В. Актысюк // Заря. – 1979. – 22 сентября.

## Мазуры – 285 гадоў

**Мазуры** - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце, за 31 км ад г. Кобрына, 75 км ад Брэста. Знаходзіцца каля шашы Мінск-Брэст.

У 1731 г. Мазуры, ці Беразіно, - маёнтак у Брэсцкім ваяводстве ВКЛ. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1897 г. вёска ў Іласкай воласці, 49 двароў, 297 жыхароў, хлебазапасны магазін, 421,7 дзесяціны зямлі (1890). У 1905 г. 313 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Іласкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 49 двароў, 269 жыхароў. У 1930-я гады працавалі школа, вячэрнія курсы, чытальня. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Дзямідаўшчынскім. У 1940 г. - 401 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну Мазуры акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941г. па ліпень 1944 г. З 16.7.1954 г. вёска ў Грушаўскім сельсаветах, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне, з 21.1.1961 г. - у Гарадзецкім сельсавеце. Паводле перапісу 1959 г. вёска налічвала 194 жыхары, у 1970 г. – 225 жыхароў. У 1949 г. арганізаваны калгас імя М. Астроўскага (старшыня М.

Багачук). На 1.1.1999 г. - 48 двароў, 75 жыхароў, магазін, у складзе калгаса-камбіната імя Дзяржынскага (з 2004 г. ААТ "Гарадзец-Агра"). На 1.01.2015 г. колькасць насельніцтва складае 26 жыхароў.

Вёска - радзіма камандзіра партызанскага атрада імя С.М. Кірава Брэсцкага партызанскага злучэння П.Н. Паплаўскага (1913-1943). Мемарыяльная дошка П.Н. Паплаўскаму ўстаноўлена на будынку магазіна ў 1975 г.

**Мазуры** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2.Брэсцкая вобласць. - С. 165.

**Князева, В.М. Мазуры** / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 593-594 – ( З гісторыі населеных пунктаў).

## Павіцце – 470 гадоў

**Павіцце (**мясцовая назва Повітьте), вёска, цэнтр Павіццеўскага сельсавета, за 49 км ад г. Кобрына, 95 км ад Брэста. Аўтадарогамі звязана з Маларытай, Кобрынам, Драгічынам.




У 1546 г. вёска ў Ратненскім павеце ВКЛ. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Валынскай губерні. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Лелікаўскай гміне Камень-Кашырскага павета Палескага ваяводства, вёска і хутар, 309 дамоў, 1651 жыхар. У 1930-я гады працавалі школа, вячэрнія курсы, чытальня, тэатральны і харавы гурткі. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. цэнтр сельсавета, з 8.8.1959 г. - у Кобрынскім раёне. У 1940 г. вёска, 301 двор, 2328 жыхароў, маторны млын, пачатковая школа, сельсавет, магазін. У Вялікую Айчынную вайну ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінула 70 землякоў. На ўшанаванне іх памяці ў 1982 г. каля клуба ўстаноўлены помнік. На 2-х вясковых могілках пахаваны 20 партызан і мірныя жыхары, загінуў-шыя ў гады вайны. У 1967 г. устаноўлены помнік). У 1947 г. працавалі хата-чытальня, бальніца, сямі-гадовая школа. У 1949 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў

калгас імя Будзённага. Паводле перапісу 1959 г. Павіцце налічвала 1732 жыхары, у 1970 – 2244 жыхары. На 1.1.1999 г. у вёсцы 767 двароў, 1982 жыхары, цэнтр саўгаса “Арэхаўскі”, будынкі выканкама сельсавета і адміністрацыі саўгаса. Ёсць 6 магазінаў, бальніца, аптэка, ветучастак, аддзяленне сувязі, Дом культуры, бібліятэка, сталовая, сярэдняя школа. Дзейнічаюць лясніцтва, камбінат бытавога абслугоўвання. На 1.01. 2015 г. колькасць насельніцтва складае 1489 жыхароў.




Помнік архітэктуры: Прачысценская царква (1911).

Помнікі землякам, на магілах партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.



**Земля** и люди Повитья / автор текста Н.С. Васюк; редактор П.Н. Тишук. – Брест. – 2014. – Брошюра о Повитьевском крае в связи с 65-летием создания коллективного хозяйства.

**Князева, В.М.** Павіцце / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 599. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

**Лаўрэцкі, Г.А.** Павіццеўская Прачысценская царква / Г.А. Лаўрэцкі // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2000. – Т. 11. – С. 470.

**Павіцце** // Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. / рэд. кал.: П.У. Броўка і інш. – Мінск, 1973. – Т. 7. - С. 590.

**Павіцце** // Беларуская энцыклапедыя: у 18т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2000. – Т. 11. – С. 470.

**Павіцце** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 175.

**Повитье** // Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. - Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 242.

**Повитьевская** церковь Рождества Богородицы // Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. - Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 242-243: фото.

**Повитье:** статус агрогородка обязывает ко многому // Кобрин-информ. - 2011. - 3 февраля. - С. 1, 3. - Повить приобрела статус агрогородка.

**Саўчук, П.** Бяздоннае месца / П. Саўчук // Народная газета. - 2011. - 20 мая. - С. 15. - Гісторыя назвы вёскі Павіцце Кобрынскага раёна.

**Сацук, А.** Газ пришёл в Повитье / А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 2010. - 7 жніўня. - С. 2. - В д. Повитье обустраивается агрогородок.

**Бялоў, Д.** Праблемы, якія вырашаюцца / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 7 красавіка. - С. 1-2. – Вёска Павіцце ў хуткім часе будзе аграгарадком.

**Жук, Е.** И в Повитье будет газ / Е. Жук // Вечерний Брест. - 2010. - 9 июля. - С. 7. - Газопровод в д. Повитье.

**Сацук, А.** Буслы над вёскай / А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 2010. - 21красавіка. - С. 3. - Добраўпарадкаванне вёскі Павіцце.

**Пянко, А.** Праздник в кругу друзей / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 11 кастрычніка. – С. 1, 2. – 460 лет д.Повіть, 95 лет со дня освеўенія местного храма.

**Панасюк, Н.** В будущее - с родным селом / Н. Панасюк // Белорусская нива. – 2006. – 22 февраля. – С. 2. – Деревня Повить.

**Хильчук, М.** Повитье хорошеет / М. Хильчук // Кобрынскі веснік. – 16 ліпеня. – С. 1. – Благоустройство д. Повить.

**Пятроўская, М.** Павіццеўскія навіны / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2005. – 19 студзеня. – С. 3.

**Хильчук, М.** Переплелись легенды и история / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 28 верасня. – С. 3. – О д. Повитье.

**Пятроўская, М.** Натхнілі радкі з мінулага / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2004. – 25 лютага. – С. 3. – Добраўпарадкаванне в. Павіцце.

**Пятроўская, М.** Павіццеўскія навіны / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 22 ліпеня. – С. 3.

**Пятроўская, М**. Павіцце прыгажэе / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 3 мая. – С. 6. – Добраўпарадкаванне в.Павіцце.

**Коренчук, П.** Деревенька моя… / П. Коренчук // Кобырнскі веснік. – 2000. – 2 жніўня. – С. 3. – Об истории названий деревень Городецкого, Онисковичского с/с, д. Повить.

**Пянко, А.** Змяняецца аблічча Кобрыншчыны / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1999. – 23 студзеня. – Упамінаецца в. Павіцце.

**Петров, Ю.** "Журавли" средь Повити стоят / Ю. Петров // Заря. – 1999. – 25 февраля. – С. 2. – О д. Повить; есть фотографии.

**Так** выглядае сёння цэнтр в. Павіцце // Кобрынскі веснік. – 1993. – 13 лістапада.

**Камяндант, С.** Сучаснае і мінулае вёскі Павіцце / С. Камяндант // Камуністычная праца. – 1977. – 10 лістапада.

**Дудко, И.** Встреча с будущим / И. Дудко // Заря. – 1968.- 24 декабря. – Жители Повити обсуждают перспективу застройки деревни.

## Смалярня– 95 гадоў

**Смалярня -** вёска ў Астроміцкім сельсавеце, за 30 км ад г. Кобрына, 74 км ад Брэста.

У 1921 г. Смалярня – вёска ў Іласкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства Польшчы, вёска, 7 двароў, 22 жыхары. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. да 16.7.1954 г. у Іласкім сельсавеце, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. 134 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну у баях каля вёскі загінулі 2 воіны Савецкай Арміі (помнік устаноўлены ў 1969 г.). У 1949 г. у вёсцы арганізаваны калгас імя Ракасоўскага. Паводле перапісу 1959 г. Смалярня налічвала 116 жыхароў, у 1970 г. – 95 жыхароў. На 1.1.1999 г. у вёсцы 18 двароў, 34 жыхары, у складзе калгаса «Праўда» (з 2004 г. СВК "Шамятоўка"). На 1.01. 2015 г. колькасць насельніцтва складае 18 жыхароў.

Помнік на магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**Князева, В.М.** Смалярня / В.М. Князева // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 599. – ( З гісторыі населеных пунктаў).

**Смалярня** // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 184.

**Хільчук, М.** У маленькай ціхай Смалярні… / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 20 снежня. – С. 3.

# Памятныя даты вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем

## Да 100-годдзя з дня нараджэння М.С. Абразцова



**Абразцоў Міхаіл Сямёнавіч** нарадзіўся ў 1916 г. Закончыў Харкаўскае ваенна-палітычнае вучылішча (1941). Малодшы палітрук, камісар батарэі, з лютага 1942 г. камісар дывізіёна 889-га артылерыйскага палка. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны служыў у 200-й стралковай дывізіі, трапіў у палон, уцёк. У 1943-1944 гг. - камісар партызанскага атрада імя Чапаева. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, медалямі. Памёр у 1998 г.

**Абразцоў Міхаіл Сямёнавіч /** падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 213. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## Да 100-годдзя з дня нараджэння М.Г. Бажадомава



**Бажадомаў Мікалай Георгіевіч** нарадзіўся ў 1916 г. у в. Ягаднае Стаўрапольскага раёна Куйбышаўскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ў ліпені 1941 г. добраахвотнікам пайшоў на фронт. Пад Вязьмай трапіў у акружэнне, быў узяты ў палон. У час перавозкі ваеннапалонных на ўчастку Баранавічы - Лясная ўцёк з цягніка. З сакавіка 1943 г.- партызан атрада імя Шчорса. У красавіку 1943 г. - красавіку 1944 г. у партызанскім атрадзе імя Катоўскага, палітрук. У маі - ліпені 1944 г. знаходзіўся ў рэзерве пры Брэсцкім падпольным абкоме КП(б)Б. Узнагароджаны медалямі. З 1945 г. жыў і працаваў у Брэсце.

**Бажадомаў Мікалай Георгіевіч /** падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 219. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## Да 95-годдзя з дня нараджэння В.Л. Белюся

**Белюсь Васіль Лукіч** нарадзіўся ў 1921 г. у в. Агароднікі. Працоўную дзейнасць пачаў з 15 гадоў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1949 г. стаў працаваць у калгасе «Запаветы Ільіча» Кобрынскага раёна, дзе шмат гадоў быў брыгадзірам паляводчай брыгады. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1965), іншымі ўзнагародамі.



**Белюсь Васіль Лукіч** / падрыхтавала Т.С. Назарук // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 427. – (Вызначыліся працай. Ардэнаносцы).

**Белюсь Васіль Лукіч** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## Да 100-годдзя з дня нараджэння С.І. Бялугіна

**Бялугін Сяргей Іванавіч** нарадзіўся ў 1916 г. Са снежня 1939 г. жыў і працаваў у Кобрыне. У Вялікую Айчынную вайну старшы сяржант С.І. Бялугін служыў у 38-м палку сувязі. Удзельнічаў у вызваленні Кобрыншчыны. Дзень Перамогі сустрэў у Берліне. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны ІІ ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Бялугін Сяргей Іванавіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 233-234. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## Да 95-годдзя з дня нараджэння Ф.К. Валасюка



**Валасюк Фёдар Канстанцінавіч** нарадзіўся ў 1921 г. у в. Багуславічы Жабінкаўскага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў у 15-гадовым узросце. У гады Вялікай Айчыннай вайны баец партызанскага атрада імя Фрунзе Брэсцкага злучэння, з 1944 г. у радах Савецкай арміі. У пасляваенныя гады працаваў у органах унутраных спраў г. Кобрына, а ў 1958 г. быў абраны старшынёй праўлення калгаса «XXI з’езд

КПСС» Кобрынскага раёна. Пад яго кіраўніцтвам калгас ператварыўся ў перадавую гаспадарку. Першым у раёне пачаў будаваць жылыя хаты для працаўнікоў калгасу, аб'екты сацкультбыта. Працягваў працаваць старшынёй калгасу да выйсця на пенсію. За дасягнутыя поспехі ў 1966 г. Ф.К. Валасюку было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. У 1970 г. скончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут (цяпер – Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. Памёр 25 студзеня 1980 г.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

**Адамович, А**. Земля отцов / А. Адамович // Земные звёзды : очерки о Героях Социалистического Труда Брестской области. – Минск, 1978. – С. 63-69. – О Герое Социалистического Труда Ф.К. Волосюке.

**Валасюк Фёдар Канстанцінавіч /** падрыхтавала Т.С. Назарук **//** Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 426. – (Вызначыліся працай. Героі Сацыялістычнай працы).

**Валасюк Фёдар Канстанцінавіч** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Волосюк** Фёдор Константинович // Твои герои, Беларусь. Герои Социалистического Труда: биографический справочник. – Минск, 2014. – С. 65.

**Пішчык, В.** Сейбіт / В. Пішчык // Сяло мае роднае. – Мінск, 1968. – С. 163-166.

**Бялоў, Д.** Адным жыццём – з зямлёю роднай і з народам / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2011. – 19 студзеня. - С. 4.

**Сацук, А.** Золотая звезда Фёдора Волосюка / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 2006. – 18 студзеня. – С. 2.

**Хільчук, М.** Вяртаючыся ў мінулае / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2001. – 17 студзеня. – С. 2. – Да 80-годдзя з дня нараджэння Ф.К. Валасюка.

**Хільчук, М.** Старшынёва Зорка / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1998. – 28 кастрычніка. – С. 2.

**Валасюк, Ф.** Клопат акупаецца / Фёдар Валасюк // Камуністычная праца. – 1985. – 4 чэрвеня.

**О награждении** тов. Волосюка Ф.К. Указом Президиума Верховного Совета БССР Почетной грамотой Верховного Совета Белорусской ССР // Заря. – 1971. – 22 января.

**Валасюк Фёдар Канстанцінавіч** [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя: свабодная энцыклапедыя. - Рэжым доступа: https://be.wikipedia.org /wiki/Фёдар_Канстанцінавіч_Валасюк/ - Дата доступа: 12.11.2015.

## Да 85-годдзя з дня нараджэння У.Л. Верхаўца



**Верхавец Уладзімір Лукіч** - дзяржаўны дзеяч БССР. Нарадзіўся 23 мая 1931 г. у в. Літвінкі. Закончыў Брэсцкі настаўніцкі інстытут імя А.С.Пушкіна (1953). Скончыў ВПШ пры ЦК КПСС ў 1970. З 1953 на камсамольскай працы ў Брэсцкай вобласці. У 1953-1962 гг. - інструктар Брэсцкага абкама, Давыд-Гарадоцкага райкама, 1-ы сакратар Жабінкаўскага райкама, 2-і, 1-ы сакратар Брэсцкага абкама ЛКСМБ. З 1962 г. - 2-і сакратар Столінскага РК КПБ, з 1963 сакратар парткама вытворчага кіравання, 1-ы сакратар РК КПБ у Драгічыне. З 1970 г У.Л. Верхавец - 1-ы сакратар Кобрынскага РК КПБ, сакратар Брэсцкага абкама КПБ.

У.Л. Верхавец працяглы час плённа ўзначальваў Дзяржаўны камітэт БССР прафесійна-тэхнічнай адукацыі (1980-1988), Ён прадстаўнік Дзяржкамадукацыі СССР у Анголе (1988-1991). З 1993 г. працаваў метадыстам Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі.

Уладзімір Лукіч вельмі любіў гумар, шырока і ўмела ўжываў яго як у афіцыйных прамовах, так і ў індывідуальных гутарках. Заўвагі, парады даваў у выглядзе народных прымавак, гумару. Усе тагачасныя з’явы перабудовы знаходзілі ў яго гумарыстычна-сатырычную інтэрпрэтацыю, сугучную народнай. Ужо будучы на пенсіі, займаўся сваім шматгадовым захапленнем - вырошчваннем памідораў у кватэры.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1980-1990 гг. Кандыдат у члены ЦК КПБ з 1981 г. Узнагароджаны ордэнамі «Знак пашаны», Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі.

Памёр у 2003 г.


**Верхавец Уладзімір Лукіч** / падрыхтавала Т.С. Назарук // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 451. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Верховец Владимир Лукич** // Биографический справочник - Мн.: «Белорусская советская энциклопедия» имени Петруся Бровки, 1982. - Т. 5. - С. 111.

**Величко, В.** Жизненные версты Владимира Верховца / Владимир Величко // Заря. – 2011. – 24 мая. – С. 5.

**Хорошко, Н.** Просветитель и гуманист / Н. Хорошко // Заря. – 2001. – 22 мая. – С. 2.

**Уладзімір Лукіч Верхавец** // Вікіпедыя: свабодная энцыклапедыя. – Рэжым доступу**:** https://be.wikipedia.org/wiki/Уладзімір_Лукіч_Верхавец. – Дата доступа: 10.11. 2015.

## Да 110-годдзя з дня нараджэння Я.Т. Гілецiча

**Гілецiч Якаў Трафімавіч** нарадзіўся ў 1906 г. у в. Сухоўчыцы.



Працоўную дзейнасць пачаў у бацькоўскай гаспадарцы.

З 1944 г. знаходзіўся на фронце ў радах Савецкай арміі, у пасляваенныя гады адным з першых уступіў у калгас, дзе шмат гадоў узначальваў жывёлагадоўчую ферму ў калгасе «XXI з'езд КПСС». Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), іншымі ўзнагародамі.

**Гілецiч Якаў Трафімавіч** / падрыхтавала Т.С. Назарук // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 427. – (Вызначыліся працай. Ардэнаносцы).

**Гілецiч Якаў Трафімавіч** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## Да 80-годдзя з дня нараджэння П.Г. Гука



**Гук Павел Гаўрылавіч** нарадзіўся ў 1936 г. у в. Батчы. Пасля заканчэння Маларыцкага сельскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча працаваў трактарыстам у МТС, служыў у Савецкай арміі. З 1962 г. быў механізатарам калгаса «Запаветы Ільіча». Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1973), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), медалямі.

**Гук Павел Гаўрылавіч** / падрыхтавала Т.С. Назарук // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 427. – (Вызначыліся працай. Ардэнаносцы).

**Гук Павел Гаўрылавіч** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## Да 70-годдзя з дня нараджэння М.І. Дзямчука

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** - беларускі вучоны-фізік, дзяржаўны дзеяч, доктар фізіка-матэматычных навук (1983), прафесар (1985), член-карэспандэнт Нацыянальнай АН Беларусі (1986). Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (1996), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР 1986 г.



Нарадзіўся 28 мая 1946 г. у в. Дзевяткі. Пасля заканчэння сярэдняй школы № 2 г. Кобрына ў 1963 г. паступіў на фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1968-1970 гг. - аспірант кафедры ядзернай фізікі БДУ. Пасля аспірантуры працаваў ва універсітэце малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам (1970-1976), загадчыкам лабараторыі паўправадніковай электронікі (1976-1984), загадчыкам аддзела сродкаў аўтаматызацыі навуковых даследаванняў Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем БДУ (1978-1980), загадчыкам кафедры аўтаматызацыі навуковых даследаванняў і сакратаром парткома БДУ (1983-1985). У 1985-1988 гг. загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ. З 1988 г. – міністр народнай адукацыі БССР. З 1991 г. намеснік Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, курыраваў пытанні адукацыі, навукі, культуры, аховы здароўя. З ліпеня 1994 г. рэктар Беларускай політэхнічнай акадэміі. У 2000-2001 гг. - намеснік прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт Міжнароднай акадэміі тэхнічнай адукацыі, акадэмік Міжнароднай акадэміі вышэйшай школы, акадэмік Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі, віцэ-прэзідэнт Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі. Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Рэспублікі Беларусь. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1986), народным дэпутатам СССР (1989).

М.І. Дзямчук - спецыяліст у галіне навуковага прыборабудавання і квантавай радыёфізікі. Створаныя ім прыборы і сістэмы працуюць больш чым у 30 навуковых цэнтрах Беларусі, Расіі, Германіі, ЗША і іншых краін, што дазволіла правесці серыю эксперыментаў з новымі навуковымі і практычнымі вынікамі, вырашыць шэраг задач у галіне эксперыментальнай і тэхнічнай фізікі. Аўтар больш 300 навуковых прац, у тым ліку 40 вынаходстваў і 2 манаграфій. Кіраўнік (1973-1998) больш чым 30 навукова-даследчых работ, праектаў і праграм. Падрыхтаваў 10 кандыдатаў і дактароў навук. У апошнія гады ў сферы навуковых інтарэсаў М.І. Дземчука былі праблемы адукацыі і развіцця навукі ў

рэспубліцы, тэорыя і практыка стварэння сучасных навукаёмістых, канкурэнтаздольных вытворчасцей і тэхналогій. Аўтар шэрагу прац і канцэптуальных палажэнняў па праблемах будаўніцтва нацыянальнай сістэмы адукацыі, стварэння новых адукацыйных тэхналогій і навучальных устаноў інтэграванага тыпу, развіцця прафесійнай школы ў рынычных адносінах, аптымізацыі кіруючых структур у галіне адукацыі.

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** / падрыхтавалі А.І. Валахановіч**,** М.В. Іванова, В.П. Лясун, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, І.П. Прымачук, І.Я. Швед, С. Юркевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 434. – (Імі ганарацца землякі).

**Мешечко, Е.Н.** Демчук Михаил Иванович / Е.Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Нёмана, Западного Буга и Припяти / Е.Н. Мешечко. – Брест, 2012. – С. 225-226.

**Этот** день в истории // Советская Белоруссия. – 2011. – 28 мая. – С. 30.

**Министр** учился в средней школе №2 : ими гордится Кобрин // Кобрин-информ. - 2009. - 17 сентября. – С. 26.

**Славутыя** землякі // Кобрынскі веснік.- 2004.- 28 лютага. - С. 4.

**Акадэмія** сацыяльнага аптымізму // Звязда. - 1998. - 18 лістапада. – С. 3. - Гутарка з М. Дзямчуком па тэме “Студэнт на рубяжы стагоддзяў: адчуванне перспектывы”.

**Дзямчук, М.** “Мы павінны ісці да перадавой мадэлі развіцця вышэйшай школы” / М. Дзямчук // Настаўніцкая газета.- 1998.- 31 сакавіка. – С. 2.

**Ганарымся** земляком! // Кобрынскі веснік.- 1996. - 8 чэрвеня.- С. 1. - М.І. Дзямчуку – 50 год.

**Дзямчук, М.** Каб словы пераплавіліся ў справы / М. Дзямчук, [гутарыў] А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 1995. - 25 лістапада. – С. 2. - Інтэрв’ю з прафесарам М. Дзямчуком.

## Да 95-годдзя з дня нараджэння М.І. Домнікава

**Домнікаў Мікалай Іванавіч** нарадзіўся ў 1921 г. у в. Зензявятка Валгаградскай вобласці. Закончыў Сталінградскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1943). Са жніўня 1943 г. ваяваў на 4-м Украінскім фронце, з кастрычніка 1944 г. да мая 1945 г. у складзе 523-га авіяцыйнага разведвальнага палка - на 3-м Беларускім фронце. Дзень Перамогі сустрэў у Кёнігсбергу. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. З 1955 г. у запасе, малодшы лейтэнат. Жыў у Кобрыне.

**Домнікаў Мікалай Іванавіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 241. – (Крутымі дарогамі вайны).

## Да 90-годдзя з дня нараджэння Н.І. Дудко

**Дудко Надзея Ільінічна** нарадзілася ў 1926 г. у г. Варонеж, Расія. Закончыла Брэсцкае педагагічнае вучылішча (1949). Працавала настаўніцай пачатковых класаў у в. Літвінкі, у СШ № 2 Кобрына. Званне “Заслужаны настаўнік”прысвоена ў 1968 г.

**Дудко Надзея Ільінічна** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 430. – (Вызначыліся працай. Заслужаныя настаўнікі).

## Да 95-годдзя з дня нараджэння П.М. Загорнага

**Загорны Павел Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1921 г. у Архангельскай вобласці. У Чырвонай арміі з 1940 г., служыў на заходняй граніцы. У Вялікую Айчынную вайну пры адступленні трапіў у палон, праз месяц уцёк. З сакавіка 1942 г. да ліпеня 1944 г. у партызанскім атрадзе імя Паставалава брыгады імя Чкалава. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. У жніўні 1944 г. прызваны ў Чырвоную армію, удзельнічаў у ваенных дзеяннях. Пасля дэмабілізацыі ў 1945 г. жыў і працаваў у Кобрыне. Узнагароджаны медалямі.

**Загорны Павел Мікалаевіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 241-242. – (Крутымі дарогамі вайны).

## Да 75-годдзя з дня нараджэння У.Р. Іванюка



**Іванюк Уладзімір Рыгоравіч** – вучоны ў галіне аховы раслінаводства, член-карэспандэнт НАН Беларусі (2003), член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь (1992-2002), доктар біялагічных навук (1982), прафесар (1992).

Нарадзіўся 23.07.1941 г. у в. Мяфёдавічы. Скончыў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С. Пушкіна (1964). З 1964 г. - малодшы навуковы

супрацоўнік Беларускага НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва, у 1971-1986 гг. - старшы навуковы супрацоўнік; у 1986-1989 гг. - загадчык аддзелам, у 1989-1999 гг. - галоўны навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута (НДІ) абароны раслін. З 1999 г. У.Р. Іванюк - галоўны навуковы супрацоўнік Беларускага НДІ бульбаводства (з 2006 г. - Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводству і плодаагародніцтву). Адначасова ў 1998-2005 гг. - прафесар кафедры Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта і кафедры БГСХА.

Навуковыя працы ў вобласці імунітэту і абароны сельскагаспадарчых культур ад хвароб і шкоднікаў. Правёў вывучэнне біялогіі ўзбуджальнікаў хвароб бульбы, агароднінных культур, лубіна і інш. Усталяваў структуру папуляцый і яе дынаміку ў прасторы і часу. Выявіў эфектыўнасць шэрагу агратэхнічных прыёмаў, пестыцыдаў і біялагічных сродкаў абароны супраць комплексу грыбных і бактэрыяльных захворванняў. Распрацаваў матэматычныя мадэлі ўзаемаадносін у сістэме "расліна - патаген - навакольнае асяроддзе", якія дазваляюць прагназаваць характар праявы найболей шкоднасных захворванняў сельскагаспадарчых культур у Беларусі і планаваць аб'ёмы правядзення ахоўных мерапрыемстваў. Выявіў спосабы прыгнечання паразітычнай актыўнасці патагенаў і павышэнне хваробаустойлівасці сельскагаспадарчых культур.

У.Р. Іванюк - аўтар каля 500 навуковых прац, у тым ліку 13 манаграфій, 12 аўтарскіх пасведчанняў.

Асноўныя працы:

- Проблемы иммунитета сельскохозяйственных растений к болезням. Мн., 1988 (совм. с Н.А.Дорожкиным, А.Н.Палиловой).
- Болезни и вредители овощных культур. Мн., 1994 (совм. с Н.Н.Колядко, М.С. Комаровой).
- Защита картофеля от болезней, вредителей и сорняков. Мн., 2003 (совм. с С.А. Банадысевым, Г.К. Журомским).

Памёр 22.05.2009 г.

**Иванюк** Владимир Григорьевич // Регионы Беларуси: в 7 т. – Минск, 2009. – Т.1. Кн.1. Брестская область. – С. 415.

**Іванюк Уладзімір Рыгоравіч** (1941, Кобрынскі раён – 2009) - вучоны ў галіне аховы раслінаводства, член-карэспандэнт НАН Беларусі. - 75 гадоў з дня нараджэння // Новыя кнігі. Па старонкахбеларускага друку. – 2015. - № 9. – С.6.

**Владимир** Григорьевич Иванюк (К 65-летию со дня рождения) // Весці НАН Беларусі. Сер. аграрных навук. - 2006. - № 3.

**Владимир** Григорьевич Иванюк (К 70-летию со дня рождения) // Весці НАН Беларусі. Сер. аграрных навук. - 2011. - № 3.

**Член-карэспандэнт** Іванюк Уладзімір Рыгоравіч [Электронны рэсурс] // Нацыянальная акадэмія навук Беларуси. – Режим доступа: http://nasb.gov.by/bel/members/memoriam/ivanyuk.php. - Дата доступа : 10.11. 2015.

## Да 85-годдзя з дня нараджэння В.Г. Качурка

**Качурка Вольга Рыгораўна** нарадзілася ў 1931 г. у в. Астроўе Маларыцкага раёна. Закончыла Брэсцкае педагагічнае вучылішча. У 1956 - 1963 гг. настаўніца Дзівінскай СШ, у 1963 - 1983 гг. у сярэдняй школе в. Верхалессе, у 1983 - 1985 гг. - у СШ № 6 Кобрына. Званне "Заслужаны настаўнік" прысвоена ў 1977 г.

**Качурка Вольга Рыгораўна** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 430. – (Вызначыліся працай. Заслужаныя настаўнікі).

## Да 115-годдзя з дня нараджэння І.С. Кіцеля



**Кіцель Іван Сямёнавіч** нарадзіўся ў 1901 г. у в. Дарапеевічы Маларыцкага раёна Брэсцкай вобл. Працаваў на гаспадарцы. З прыходам у 1920 г. на Кобрыншчыну Чырвонай арміі ўдзельнічаў у арганізацыі камсамольскіх ячэек. У 1933 г. уступіў у КПЗБ. Удзельнік Навасёлкаўскага выступлення сялян 1933 г. Пасля яго падаўлення арыштаваны і прыгавораны да смяротнага пакарання, замененага пажыццёвым зняволеннем. Знаходзіўся ў турмах у Кобрыне, Равічах, Вронках. У пачатку 2-й сусветнай вайны, калі Германія напала на Польшчу, выйшаў на волю. Пасля вызваленчага паходу Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь (верасень 1939) прымаў удзел у арганізацыі калгасаў, працаваў брыгадзірам. У Вялікую Айчынную вайну - сувязны партызанскага атрада імя Фрунзе. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына. З 1944 г. у Чырвонай арміі, вызваляў Варшаву. З 1945 г. на радзіме, з 1971 г. жыў і працаваў у Кобрыне. На пенсіі з 1961 г. Памёр у 1991 г.

**Кіцель Іван Сямёнавіч /** падрыхтавала Н.М. Пліско // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 115. – (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне 1921-1939).

**Бялова, М.** За нашу і вашу свабоду / М. Бялова // Камуністычная праца. – 1977. – 7 чэрвеня. – (Кастрычнік у яго лёсе).

## Да 70-годдзя з дня нараджэння П.Р. Кужыра

**Кужыр Павел Рыгоравіч** - вучоны. Нарадзіўся ў 1946 г. у в. Батчы. Кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, загадчык кафедры фізікі Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі. Аўтар падручнікаў па фізіцы для вышэйшай школы.

**Кужир, П. Г.** Диагностика при проектировании учебных занятий / П. Г. Кужир [и др.] ; Белорусский национальный технический университет. – Минск, 2013.




**Кужир, П. Г.** Общая физика: электричество и магнетизм : сборник задач / П. Г. Кужир. – Мінск: изд-во Гревцова, 2013.

**Кужир, П. Г.** Сборник задач по общему курсу физики : учебное пособие для студентов высших учебных заведений по техническим специальностям : в 2 ч. / П. Г. Кужир, Н. П. Юркевич, Г. К. Савчук ; Министерство образования Республики Беларусь, Белорусский национальный технический университет. – Минск, 2014.- Ч. 1: Механика, статистическая физика и термодинамика.

**Кужир, П. Г.** Прикладная ядерная физика : учеб. пособие для вузов / П.Г. Кужир. – Минск, 2003.

**Кужир, П. Г.** Физика конденсированных сред : учеб. пособие для вузов / П.Г. Кужир, А.А. Баранов, А.П. Каравай, Н.П. Юркевич. – Минск, 2002.

**Кужыр Павел Рыгоравіч** / падрыхтавалі А.І. Валахановіч**,** М.В. Іванова, В.П. Лясун, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, І.П. Прымачук, І.Я. Швед, С. Юркевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

## Да 110-годдзя з дня нараджэння А.І. Марозава

**Марозаў Андрэй Ільіч** нарадзіўся 19.8.1906 г. у в. Буда Крупскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Гомельскі лесатэхнічны інстытут імя Кірава, сакратар Магілёўскага гаркома КП(б)Б. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны зацверджаны начальнікам штаба атрадаў народнага апалчэння г. Магілёва, трапіў у акружэнне, з баямі вырваўся з яго, узяты ў палон, уцёк. У 1941-1944 г. - баец партызанскага атрада імя Катоўскага. З чэрвеня 1944 г. да сакавіка 1946 г. сакратар Магілёўскага гаркома КП(б)Б, пазней загадчык аддзела Магілёўскага абкома партыі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі. Памёр 19.8.1974 г.

**Марозаў Андрэй Ільіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 244. – (Крутымі дарогамі вайны).

**Марозаў Андрэй Ільіч** [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин . – Режим доступа : http://ikobrin.ru/kobrin-90.php. – Дата доступа: 10.11. 2015.

## Да 95-годдзя з дня нараджэння І.М. Мацвеева



**Мацвееў Іван Мацвеевіч** нарадзіўся 13.2.1921 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. З 1941 г. ваяваў у 533-м армейскім Кобрынскім знішчальным процітанкавым артылерыйскім палку, прайшоў шлях ад радавога да маёра, удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Мацвееў Іван Мацвеевіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 233-234. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

**Мацвееў Іван Мацвеевіч** [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин . – Режим доступа : http://ikobrin.ru/kobrin-90.php. – Дата доступа: 10.11. 2015.

## Да 95-годдзя з дня нараджэння У.Ф. Міжэўскага



**Міжэўскі Уладзімір Фёдаравіч** нарадзіўся 22.6.1921 г. у г. Мазыр Гомельскай вобл. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Паўночным, Ленінградскім, 2-м Беларускім, 1-м Украінскім франтах. Прымаў удзел у баях за Беларусь, Украіну, Варшаву, Прагу і інш. У складзе 541-га асобнага радыёразведвальнага дывізіёна 1-га Украінскага фронту ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Міжэўскі Уладзімір Фёдаравіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 236. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## Да 215-годдзя з дня нараджэння Ю.А. Міцкевіча



**Міцкевіч Юльян Аляксандр** (1.08.1801-16.11.1871) - юрыст, прафесар, гісторык права. Малодшы брат паэта Адама Міцкевіча. Нарадзіўся ў Навагрудку Гродзенскай губерніі. Пачатковую адукацыю атымаў у Навагрудскай дамініканскай школе. У 1819 г. паступіў у Віленскі універсітэт на юрыдычны факультэт, які закончыў з адзнакай. У час студэнцтва актыўна дзейнічаў у таварыстве філарэтаў, за што быў арыштаваны і ў лістападзе 1823 - красавіку 1824 гг. адбываў зняволенне ў кляштары францысканцаў у Вільні. У 1825 г. яго праца «Які ўплыў магло мець рымскае заканадаўства на заканадаўства польскае і літоўскае?», напісаная яшчэ ў студэнцкія часы, была апублікавана з заўвагамі І. Лялевеля ў часопісу «Dziennik Warszawski». У 1825 г. А. Міцкевіч удасканальваў юрыдычную адукацыю ў Пецярбургскім і Маскоўскім універсітэтах, дзе ў 1826 г. быў узнагароджаны як лепшы студэнт і атрымаў ступень магістра абодвух правоў – заканадаўчага і царкоўнага. З 1828 г. працаваў настаўнікам у Крамянецкім ліцэі на Валыні,

прафесар рымскага права ва універсітэтах св. Уладзіміра ў Кіеве (з 1835) і ў Харкаве (з 1838 г. – прафесар і дэкан юрыдычнага факультэта Харкаўскага ўніверсітэта). У 1857 г. купіў маёнтак Губерня пад Кобрынам, дзе жыў з сям'ёй пасля выхаду ў адстаўку (прыкладна з 1858). Тут ён у перапынках паміж гаспадарчымі справавамі рыхтаваў да друку навуковыя працы «Энцыклапедыя права» і «Курс рымскага права». Выдаў у Варшаве вучэбны дапаможнік па "Літоўскаму Статуту". У 1863 г. А. Міцкевіч дапамагаў паўстанцам атрада Р. Траўгута. Ёсць меркаванне, што яго сын Францішак быў сябрам Кобрынскага атрада.

А. Міцкевіч высока цаніў свайго старэйшага брата як паэта, сабраў вялікую бібліятэку ў памяць аб ім і перадаў у Кобрынскі хрысціянскі храм і Варшаўскую Акадэмію навук. Апублікаваў артыкулы "О быте и этнографии крестьян Кобринского уезда».

За гады жыцця на Кобрыншчыне сям'ю Міцкевічаў неаднойчы наведвалі пляменнікі - дзеці Адама Міцкевіча - Уладзіслаў (упершыню наведаў Кобрын у 1861), Марыя (у 1862), пазней - Юзаф.

Памёр А. Міцкевіч 16 лістапада 1871 г. і захаваны на старых кобрынскіх могілках 19 ст.

У Кобрыне на старадаўніх могілках каля Петра-Паўлаўскай царквы захаваўся помнік на сямейнай магіле Міцкевічаў. Тут апрача Аляксандра пахаваны яго жонка Тэрэза і сын Францішак.



*Помнік на магіле сям'і Міцкевічаў*
*каля Петра-Паўлаўскай царквы ў Кобрыне*

**Міцкевіч Юльян Аляксандр** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 64-65. – (Людзі, звязаныя з Кобрыншчынай).

**Денисюк, О.** Александру Мицкевичу 210 лет / Ольга Денисюк // Кобрин-информ. – 2012. – 5 января. – С. 6. – В 2011 г. исполнилось 210 лет со дня рождения человека, чьё имя связано с историей Кобрина.

**Шевченко, А.** Памятник Александру Мицкевичу в Кобрине / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2007. – 19 апреля. – С. 14.

**Агеявец, А.М.** Маршрутны ліст экскурсійнай паездкі па славутых мясцінах Адама Міцкевіча / А.М. Агеявец // Народная асвета. – 2005. - №11. – С. 68. – Адзін з маршрутаў – г. Кобрын, помнік брату пісьменніка – Ю.А. Міцкевічу.

**Климец, М.** Младший брат Адама Мицкевича / М. Климец // Заря. – 2002. – 9 апреля. – С. 2.

**Сущук, А.** Сближение литератур – сближение народов / А. Сущук // Кобрынск веснік. – 1997. – 6 снежня. – С. 2. – Упоминается брат Адама Мицкевича – А. Мицкевич, живший в Кобрине.

## Да 100-годдзя з дня нараджэння К.М. Мячыкава



**Мячыкаў Канстанцін Міхайлавіч** нарадзіўся ў 1916 г. у в. Чабатовічы Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобл. Пасля заканчэння Данецкага сельскагаспа-дарчага тэхнікума (1935) працаваў аграномам. У 1939 г. прызваны ў Чырвоную армію, служыў у 125-м стралковым палку ў Брэсце. У першы дзень Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у Брэсце, потым разам з іншымі адступаў, трапіў у акружэнне ў Белавежскай пушчы. Пазней у складзе групы з 15 чалавек перабазіраваўся ў Дахлаўскі лес. З лістапада 1941 г. група правяла некалькі акцый супраць акупантаў, у лістападзе 1942 г. увайшла ў партызанскі атрад імя Суворава брыгады імя Молатава Пінскага партызанскага злучэння. К.М. Мячыкаў узначаліў дыверсійна-падрыўную групу, якая з красавіка 1943 г. да чэрвеня 1944 г. узарвала 24 варожыя эшалоны, 4 чыгуначныя масты, падарвала 2 шлюзы, знішчыла спіртзавод, 7 км тэлеграфнай сувязі, удзельнічала ў 8 баях, захапіла 45-міліметровую гармату і 200 снарадаў, 5 аўтаматаў, 40 вінтовак, 7 тыс. патронаў. К.М. Мячыкаў праводзіў агітацыйную работу сярод насельніцтва, распаўсюджваў лістоўкі, сумеў пераканаць і прывесці ў атрад 15 чалавек, якія служылі ў паліцыі. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Мячыкаў Канстанцін Міхайлавіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 223. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## Да 105-годдзя з дня нараджэння А.Д. Падаляка



**Падаляк Аляксей Данілавіч** нарадзіўся ў 1911 г. у в. Караваева Пухавіцкага раёна Мінскай вобл. Начальнік асобага аддзела. Былы аператыўнік. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны апынуўся на Брэстчыне. 22 чэрвеня 1941 г. удзельнічаў у баях у Брэсце, 23 чэрвеня пад Кобрынам, адступаў на ўсход, трапіў у акружэнне, потым у палон. Уцёк у ракіцінскія лясы (Польшча), арганізаваў партызанскую групу, разам з якой пайшоў у старасельскія лясы (Брэсцкая вобл.), дзе група ўлілася ў атрад М.М. Чарнака. У 1941-1944 г. ваяваў у партызанскіх атрадах Брэсцкага злучэння, быў камандзірам групы, камандзірам узвода атрада, намеснікам камандзіра па разведцы брыгады імя Леніна. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Брэсце.

**Падаляк Аляксей Данілавіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 216. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## Да 90-годдзя з дня нараджэння Н.А. Плотка

**Плотка Надзея Антонаўна** нарадзілася 17 мая 1926 г. у в. Стукачоўка Гомельскага раёна. Закончыла фізіка-матэматычны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута. Працавала настаўніцай, завучам СШ у г.п. Антопаль, настаўніцай у СШ № 1 і СШ № 5 Кобрына, у 1973 -1978 гг. - завуч СШ № 6. Званне “Заслужаны настаўнік”прысвоена ў 1967 г.

**Плотка Надзея Антонаўна** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 430. – (Вызначыліся працай. Заслужаныя настаўнікі).

## Да 80-годдзя з дня нараджэння І.П. Прымачука

**Прымачук Іван Платонавіч** - вучоны. Нарадзіўся 25 мая 1936 г. у в. Мацы. Кандыдат гістарычных навук (1980), дацэнт (1986), прафесар Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута (МГЭІ) (2001). У 1960 г. закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў завучам Лужкаўскай школы

Маладзечанскага раёна, выкладчыкам Мінскага індустрыяльнага тэхнікума будаўнічых матэрыялаў, інспектарам, начальнікам аддзела Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, дацэнтам Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта. З 2000 г. узначальваў кафедру сусветнай гісторыі МГЭІ. Аўтар больш чым 40 прац па гісторыі Беларусі. Адзін з аўтараў «Эканамічнай гісторыі Беларусі» (1983, 1996, 1999) і «Экономической истории зарубежных стран» (1996, 1998). Колам яго навуковых інтарэсаў з’яўляюцца міжнародныя сувязі Беларусі ў галіне адукацыі і навукі, станаўленне капіталістычных адносін на тэрыторыі Беларусі ў 2-й палове XIX - пачатку XX ст.

**Прымачук Іван Платонавіч** / падрыхтавалі А.І. Валахановіч**,** М.В. Іванова, В.П. Лясун, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, І.П. Прымачук, І.Я. Швед, С. Юркевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Примачук, И.П.** Развитие международного сотрудничества высшей школы советской Белоруссии (1959-1975 гг.) : автореф. дис.... канд. ист. наук / Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1980.

## Да 115-годдзя з дня нараджэння В.П. Пуганава



**Пуганаў Віктар Паўлавіч**, удзельнік абарончых баёў на Кобрыншчыне, генерал-маёр (1940). Нарадзіўся 27 студзеня 1901 года ў Астрахані. Працаваў пасыльным на чыгунцы, а ў 1919 годзе уступіў у Чырвоную Армію. Удзельнік грамадзянскай вайны. У гады грамадзянскай вайны праявілася яго прыродная кемлівасць, востры розум і выключная адвага. На Каўказскім фронце ён ваяваў ужо камандзірам кулямётнага ўзвода, пазней удзельнічаў у ліквідацыі белагвардзейскіх банд на Кубані. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны вучыўся ў Маскве ў вышэйшай школе ваеннай маскіроўкі. У 1928 г. закончыў ваенную акадэмію імя Фрунзе, пасля чаго быў накіраваны ў Ленінград выкладчыкам бранятанкавых курсаў. У 1940 годзе яму было прысвоена званне генерал-маёра танкавых войск і са жніўня 1940 года па сакавік 1941г. Віктар Паўлавіч служыў начальнікам упраўлення баявой падрыхтоўкі аўтабранятанкавых войск Чырвонай Арміі. Пазней ён быў назначаны камандзірам 22-й танкавай дывізіі 14 механізаванага корпуса, які дыслацыраваўся ў раёне Брэста. Тут ён і сустрэў

Вялікую Айчынную вайну.

З раніцы 22.6.1941 г. 22-й танкавай дывізіі вяла абарончыя баі на рубяжы Заходняга Буга на поўдзень ад Брэста, 23 чэрвеня ў час контрудару савецкіх войскаў з раёна Жабінкі разграміла мотакалону нямецкіх войскаў, разам з часцямі 28-га стралковага корпуса на паўночны захад ад Кобрына змагалася супраць 2 танкавых, 1 матарызаванай і некалькіх пяхотных дывізій ворага. Савецкія воіны змагаліся да апошняй магчымасці. Непадалёку ад вёскі Імяніны 23.6.1941 г. геройскі загінуў у танку В. П. Пуганаў. Тут байцы і пахавалі свайго камандзіра. У канцы 50-х гадоў было зроблена перазахаванне ў брацкай магіле ўсіх воінаў, якія загінулі ў баях за наш горад. Побач з брацкай магілай перазахавалі астанкі В. П. Пуганава, а сквер назвалі яго імем.

17 чэрвеня 1964 г. па рашэнню Кобрынскага выканкама раённага Савета дэпутатаў працоўных завулак Прамы быў перайменаваны ў вуліцу імя Пуганава. Яна размешчана ў паўночна-заходняй часцы горада. Адкрываецца вуліца мемарыяльнай дошкай “Вуліца імя Пуганава Віктара Паўлавіча”.

**Кононов, И. В.** В огне / И. В. Кононов // Буг в огне / ред. Н. М. Бутримович, А. П. Костелецкая. – Минск : Беларусь, 1977. - С. 151 – 156. - Воспоминания заместителя командира 22-й танковой дивизии, оборонявшей Кобрин в первые дни войны.

**Осташенко, Ф. А.** Незабываемые дни / Ф. А. Осташенко // Буг в огне / ред. Н. М. Бутримович, А. П. Костелецкая. – Минск : Беларусь, 1977. - С. 119 – 121.- Воспоминания автора главы, полковника, заместителя командира 6-й Орловской стрелковой дивизии, о совместных боевых действиях 22-й танковой дивизии под командованием генерала В. П. Пуганова.

**Пуганаў** Віктар Паўлавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – С. 510.

**Пуганаў** Віктар Паўлавіч // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / рэдкал. А.У. Языковіч (гал. рэд.), мастак В.А. Ляхар. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2010. – С. 797-798.

**Пуганаў Віктар Паўлавіч** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.139. – (1941-1945).

**Пуганов** Виктор Павлович // Их именами названы…: энциклопедический справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1987. – С. 501.

**Пуганов** Виктор Павлович // Кто есть кто в Республике Беларусь. 2005: к 60-летию Победы в Великой Отечественной войне / автор-составитель А.И. Котов. – Минск: Мэджик-Бук, 2005. – Т. 1. – С. 237.

**Митюков, А.** Комдив Пуганов / Алексей Митюков // Заря. – 2004. – 22 июня. – С. 2.

**Это страшное** слово «война»: [военные вехи Кобринщины] // Кобрынскі веснік. - 2003. - 8 мая. - С. 1 – 2. - О *В.П. Пуганове* и А.И. Морозове - героях, навечно оставшихся лежать в кобринской земле.

**Гурда, У**. І генералы гінулі ў баях / У. Гурда // Кобрынскі веснік. – 2001. - 13 чэрвеня. – С. 2. - Генерал танкавай арміі *В.П.Пуганаў* загінуў пры абароне Кобрына ў чэрвені 1941; ўраджэнец Кобрыншчыны, генерал-маёр войск сувязі Я.О. Лагадзюк - у 1944 у Даўгапілсе.

## Да 90-годдзя з дня нараджэння Д.Д. Ратнікава

**Ратнікаў Дзмітрый Дзмітрыевіч** нарадзіўся 6.6.1926 г. у в. Нова-Нікольскае Плаўскага раёна Тульскай вобласці. У 1943 г. прызваны ў Чырвоную армію, закончыў ваеннае мінамётнае вучылішча (1944). Служыў у г. Чавусы Магілёўскай вобасці, удзельнічаў у ліквідацыі вялікай варожай групоўкі - так званага Мінскага катла, удзельнічаў у баях за вызваленне Гродзеншчыны. У баях за г. Ломжа (Польшча) быў цяжка паранены, пасля лячэння накіраваны ў 194-ю асобую роту 205-га запаснога стралковага палка. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, медалямі. З красавіка 1946 г. жыў у Кобрыне.

**Ратнікаў Дзмітрый Дзмітрыевіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 245. – (Крутымі дарогамі вайны).

## Да 95-годдзя з дня нараджэння В.І. Сідзякіна



**Сідзякін Васіль Іванавіч** нарадзіўся ў 1921 г. у с. Мацвееўка Балакоўскага раёна Саратаўскай вобласці. З сакавіка 1941 г. служыў механікам-вадзіцелем у бранятанкавай часці № 9858, удзельнічаў у баях на тэрыторыі Беларусі. Летам 1941 г. часць трапіла ў акружэнне ў раёне Слуцка. В.І. Сідзякін нелегальна жыў у в. Уцёс Баранавіцкага раёна. З сакавіка 1943 г. да красавіка 1944 г. ваяваў у партызанскім атрадзе імя

Катоўскага, спачатку быў радавым, потым камандзірам аддзялення. З красавіка 1944 г. служыў у Чырвонай арміі. Дэмабілізаваны ў кастрычніку 1945 г. пасля кантузіі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Сідзякін Васіль Іванавіч** / падрыхтавалі А.В. Бабенка, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, А.М. Рысь, Н.А. Фрыдлендэр // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 225. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## Да 50-годдзя з дня нараджэння В.А. Сізюка



**Сізюк Валерый Аляксеевіч** - вучоны.

Нарадзіўся В. Сізюк у 1966 г. у Кобрыне. Выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Старшы навуковы супрацоўнік НАН Беларусі. Фізік, спецыяліст у вобласці фізічнай электронікі. Кандыдат фізіка-матэматычных навук.

Асацыяваны прафесар Універсітэта Пердью (Purdue University), ЗША, штат Індіана, г. Уэст-Лафейетт.

**Исследование** плазменных неустойчивостей и переноса заряда в полупроводниковых микроструктурах : автореферат диссертации ... кандидата физико-математических наук : 01.04.04 / Сизюк Валерий Алексеевич. - Минск, 1997.

**Сізюк Валерый Аляксеевіч** / падрыхтавалі А.І. Валахановіч**,** М.В. Іванова, В.П. Лясун, Т.С. Назарук, Н.М. Пліско, І.П. Прымачук, І.Я. Швед, С. Юркевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 441. – (Імі ганарацца землякі).

**Сізюк Валерый Аляксеевіч** [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин. – Режим доступа : http://ikobrin.ru/kobrin-139.php. – Дата доступа: 15.11. 2015.

**Valeryi** Sizyuk Research Associate Professor [Электронный ресурс] // Сайт "Purdue University". – Режим доступа : https://engineering. purdue. edu/ NE/People/ptProfile?id=39520.

## Да 60-годдзя з дня нараджэння І.І. Сінчука

